УДК 340.1

# СУВЯЗЬ СУДОВАЙ УЛАДЫ І ГРАМАДСКАСЦІ Ў САВЕЦКІ ПЕРЫЯД РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

**Г. А. Корабава**
юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта,
аспірант кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права

***Аннотация.*** *Аўтарам разглядаецца сувязь грамадскасці і суда ў савецкі перыяд развіцця беларускай дзяржаўнасці. У артыкуле прааналізаваны ідэалагічныя, палітычныя і прававыя ўмовы далучэння грамадскасці да дзейнасці судовых органаў. Актыўнае далучэнне прадстаўнікоў грамадскасці да судовай дзейнасці спрыяла павышэнню прававой культуры насельніцтва і выхавання грамадзян у духу нецярпімасці да злачыннасці.*

***Ключевые слова:*** *прававая культура, грамадскасць, савецкі перыяд развіцця беларускай дзяржаўнасці, судовая ўлада, дэмакратызацыя правасуддзя.*

***Annotation.*** *The author examines the relationship between the community and justice during the Soviet period of the development of Belarusian statehood. The article analyzes the ideological, political and legal conditions for involvement of representatives of community in the activities of judicial bodies. The active involvement of public representatives in judicial activities contributed to the improvement of the legal culture of the community and the education of citizens in the spirit of intolerance to criminality.*

***Keywords:*** *legal culture, community, the Soviet period of development of Belarusian statehood, judiciary, democratization of justice.*

Савецкі перыяд развіцця беларускай дзяржаўнасці характарызуецца актыўным далучэннем грамадскасці да ўдзелу ў правасуддзі і садзейнічання яму паводле рэалізацыі ідэй У. І. Леніна аб пабудове сацыялістычнага грамадства.

У аснову арганізацыі і дзейнасці новай судовай сістэмы былі пакладзены ленінскія ідэі аб дзяржаўнай сутнасці суда, яго месцы і ролі ў механізме сацыялістычнай дзяржавы. Ідэі У. І. Леніна сталі зыходнымі палажэннямі для вырашэння ўсіх пытанняў, звязаных з узнікненнем і функцыянаваннем судовых органаў. Зыходзячы з дзяржаўна-палітычнага характару судовай сістэмы, У. І. Ленін лічыў, што ў аснову іх арганізацыі і дзейнасці павінны быць пакладзены прынцыпы, на базе якіх будуецца сацыялістычная дзяржава, менавіта такія суды, на думку палітыка, маглі сапраўды дасягнуць мэты правасуддзя [1, с. 270].

Галоўным падмуркам дзяржаўнага, а ў тым ліку і судовага, будаўніцтва У. І. Ленін лічыў удзел працоўных у кіраўніцтве дзяржавай. Яшчэ ў 1901 годзе ён пісаў, што «для ўжывання разумных пастаноў патрэбны суддзі, якія не зведзены да становішча звычайных чыноўнікаў, патрэбны ўдзел прадстаўнікоў грамадскасці ў судзе і ўлік грамадскага меркавання пры абмеркаванні

справы» [2, с. 405]. Таксама ён адзначаў, што ганенне злачыннасці павінна тычыцца ўсяго грамадства [3, с. 23]. Ужо на пачатку 1918 года У. І. Леніным адзначалася, што на месцы старых імперскіх судоў будуецца новы, народны, савецкі суд, які засноўваецца на прынцыпе ўдзелу працоўных у кіраванні дзяржавай [4, с. 163].

Ленінскія ідэі аб удзеле працоўных у сацыялістычным правасуддзі былі замацаваны ў Другой праграме РКП(б), якая была прынята VIII з’ездам партыі 18–23 сакавіка 1919 г. (далей — праграма РКП(б) 1919 года), дзе было адзначана, што ўсё працоўнае насельніцтва павінна быць далучана да выканання судовай павіннасці. У праграме быў замацаваны прынцып выбарнасці суддзяў з ліку працоўных менавіта працоўнымі, што праводзіла неабходны на той час класавы падыход да выбарнасці суддзяў. Асаблівая ўвага надавалася роўнасці асоб мужчынскага і жаночага полу ў сваіх правах [5].

Удзел працоўных у судовай сістэме павінен быў выхоўваць насельніцтва ў духу выканання дысцыпліны і законнасці. Усе вышэйназваныя прынцыпы судовага будаўніцтва былі вызначаны непасрэдна самім характарам савецкай улады, сутнасць каторай У. І. Ленін бачыў ва ўладзе, даступнай для ўсіх, якая празрыста вядзе свае справы на вачах у масы, непасрэдна зыходзіць ад масы, з’яўляецца прадстаўніком яе волі [6, с. 381].

У пытаннях будаўніцтва судовай сістэмы У. І. Ленін меркаваў аб укараненні розных форм удзелу працоўных у сацыялістычным правасуддзі. Удзел народных засядацеляў быў прадугледжаны праграмай РКП(б) 1919 года. Удзел грамадскіх абвінаваўцаў і абаронцаў быў, на думку У. І. Леніна, адной з неабходных умоў рэалізацыі прынцыпу законнасці [7, с. 19–20].

Прыцягненне грамадзян да выканання дзяржаўных абавязкаў У. І. Ленін лічыў абавязкам дзяржаўных органаў. У прыватнасці, закліканне працоўных да адпраўлення правасуддзя ён лічыў непасрэдна абавязкам самога суда [8, с. 197]. Такім чынам, эфектыўнасць грамадскага ўдзелу ў судаводстве залежыла ад актыўнай дзейнасці саміх судоў па далучэнні шырокіх народных мас да судовай дзейнасці. Высокая грамадская актыўнасць павінна была быць вынікам выкарыстання суддзямі ўсіх магчымых сродкаў далучэння насельніцтва да судовай дзейнасці, умацавання сувязі судоў і калектываў працоўных.

Удзел грамадскасці ў правасуддзі, паводле ленінскіх ідэй, разглядаўся як форма дэмакратызацыі правасуддзя [9, с. 74].

Удзел грамадскасці ў сацыялістычным правасуддзі, заснаваны на ленінскіх ідэях, развіваў такія дэмакратычныя асновы судаводства, як выбарнасць суддзяў, ажыццяўленне правасуддзя на падставах роўнасці ўсіх грамадзян перад законам і судом, калегіяльнасць разгляду спраў, галоснасць

судовага разбору, усебаковае, поўнае і аб'ектыўнае даследаванне абставінаў справы, індывідуалізацыя абвінавачвання і справядлівасць пакарання [7, с. 25].

Удзел грамадскасці ў правасуддзі ў савецкай краіне спрыяў пашырэнню межаў галоснасці судовага разбору праз інфармаванне грамадскіх арганізацый, калектываў працоўных і грамадзян аб ходзе і выніку разгляду крымінальных спраў. Гэта, у сваю чаргу, узмацняла папераджальна-выхаваўчую функцыю правасуддзя, пашырала межы агульнай і прыватнай прэвенцыі злачынстваў. Пры ўдзеле працоўных у правасуддзі да прафесійнага вопыту суддзяў надаваўся і ўласны жыццёвы вопыт прадстаўнікоў народных мас, выкарыстанне якога дазваляла ўстанавіць факты мясцовага характару, садзейнічала больш усебаковаму даследаванню абставін справы. Праз гэты момант дасягалася і індывідуалізацыя пакарання для асуджанага.

Забеспячальная роля працоўных у здзяйсненні такой функцыі дзяржаўнага кіравання, як правасуддзе, выяўлялася ў калегіяльным разглядзе крымінальных спраў, уплыве жыццёвага вопыту на дзейнасць суда і яго рашэнні, народным кантролі за судовай дзейнасцю. У калегіяльным вырашэнні пытанняў па крымінальных справах увасаблялася калектыўная думка, што ў большай ступені магло гарантаваць правільнасць прысуду. Пры любой форме ўдзелу насельніцтва ў правасуддзі ім ацэньвалася якасць судовай дзейнасці, правасуднасць судовых актаў, што паляпшала разбор справы, павялічвала ўзровень адказнасці суддзяў пры разглядзе спраў. Менавіта праз удзел у правасуддзі грамадзяне маглі не толькі глыбока зразумець задачы, якія стаялі перад судом, але і прыняць удзел у іх выкананні, пераканацца ў справядлівасці прысуду.

Асаблівае значэнне для развіцця калектыўных форм удзелу працоўных у кіраўніцтве дзяржавай, у тым ліку і ў правасуддзі надавалася грамадскім арганізацыям, якія спрыялі развіццю ініцыятывы, творчасці, палітычнай актыўнасці грамадзян у разнастайных сферах дзяржаўнага і грамадскага жыцця, далучэнню насельніцтва да судаводства. У. І. Ленін разглядаў грамадскія арганізацыі, у асаблівасці прафсаюзныя, кааператыўныя і камсамольскія, як суб'екты далучэння працоўных да судовай дзейнасці [8, с. 405].

Набыванне шырокай групы сацыяльных правоў працоўнымі стала адной з неабходных перадумоў для ўдзелу грамадскасці ў савецкім правасуддзі. Такія фундаментальныя правы грамадзян, як права на працу, адпачынак, матэрыяльнае забеспячэнне, адукацыю, а таксама роўнасць усіх грамадзян у правах, незалежна ад іх нацыянальнасці і расы, набыванне жанчынамі роўных правоў з мужчынамі, спрыялі актыўнаму ўдзелу працоўных ва ўсіх сферах жыцця краіны [7, с. 50]. Менавіта сацыялістычная дзяржава, на думку У. І. Леніна, магла фактычна даць грамадству правы і свабоды замест іх фармальнага абвяшчэння [10, с. 185].

У другой палове XX стагоддзя ленінскія ідэі атрымалі сваё развіццё ў Трэцяй праграме Камуністычнай Партыі Савецкага Саюза, прынятай на XXII з’ездзе КПСС 17–31 кастрычніка 1961 года (далей — праграма КПСС 1961 года). Адной з галоўных задач праграмы КПСС 1961 года стала ўсебаковае разгортванне і ўдасканаленне сацыялістычнай дэмакратыі, актыўны ўдзел усіх грамадзян у кіраванні дзяржавай, паляпшэнне работы дзяржаўнага апарату і ўзмацненне народнага кантролю над яго дзейнасцю. Прадугледжвалася, што правасуддзе будуецца на сапраўды дэмакратычных асновах: выбарнасці і справаздачнасці суддзяў і народных засядацеляў, праве іх датэрміновага адклікання, галоснасці разгляду судовых спраў, удзеле ў судах грамадскіх абвінаваўцаў і абаронцаў пры строгім захаванні судом, органамі следства і дазнання законнасці, усіх працэсуальных нормаў. Дэмакратычныя асновы правасуддзя планавалася ўдасканальваць і далей [11]. Такім чынам, пачаўся новы этап савецкай дэмакратыі і спроба перайсці да станаўлення сацыялістычнага грамадства і камунізму.

Паводле напрамкаў, выпрацаваных новай праграмай, прадстаўнікам грамадскасці надавалі магчымасці паўнапраўнага суб’екта крымінальна-працэсуальнай дзейнасці. Яны прымалі ўдзел у правасуддзі па даручэнні і ад імя грамадскасці, дапамагалі ўстанаўліваць факты, якія мелі грамадскае значэнне, ацэньвалі іх з пункту гледжання грамадскага волевыяўлення, выражалі грамадскае меркаванне, раскрывалі грамадскую значнасць судовых пасяджэнняў. Такім чынам, грамадскія якасці распаўсюджваліся і на прысуды, у якіх павінна было ўлічвацца грамадскае меркаванне.

Савецкія вучоныя-правазнаўцы вызначалі грамадскасць як асобны суб’ект крымінальнага судаводства і яе склад. У прыватнасці, да грамадскасці адносіліся: грамадскія арганізацыі і іх прадстаўнічыя органы, калектывы працоўных на прадпрыемствах, установах і іх структурных частках (цэхах, аддзелах), органы грамадскай самадзейнасці насельніцтва (камітэты, камісіі), неарганізаваныя выпадковыя групы грамадзян (жыхары дома, вуліцы), асобныя грамадзяне, якіх дзяржаўныя органы далучалі да садзейнічання, народныя засядацелі. Такое шырокае тлумачэнне тэрмін «грамадскасць» набыў толькі пасля прыняцця праграмы КПСС 1961 года. Амаль што кожнага грамадзяніна, які прыняў удзел у крымінальным працэсе, ад паведамлення прадстаўнікоў дзяржаўных органаў да народных засядацеляў савецкія вучоныя-працэсуалісты прыраўноўвалі да ўдзельніка грамадскасці [7, с. 75]. Па гэтым пытанні можна пагадзіцца з думкай П. П. Якімава, які прапаноўваў размяжоўваць здзяйсненне правасуддзя суддзямі і народнымі засядацелямі, а таксама ўдзел у судаводстве юрыдычных асоб, прадстаўнікоў грамадскасці і асобных грамадзян [7, с. 81].

Удзелу грамадскасці ў савецкім крымінальным працэсе надавалася даволі вялікае папераджальна-выхаваўчае значэнне. Напрыклад, пры вылучэнні грамадскіх абвінаваўцаў і абаронцаў выкарыстоўваліся такія спосабы папераджальна-выхаваўчага ўздзеяння на грамадскасць, як інфармаванне ўдзельнікаў сходу грамадскіх арганізацый аб абставінах крымінальнай справы, тлумачэнні падсудных, выступленні падсудных, абмеркаванне членамі грамадскага калектыву справы і прыняцце імі пэўных рашэнняў, справаздача прадстаўнікоў калектыву перад астатнімі яго членамі і інш.

Але нельга не адзначыць, што ўдзел грамадскасці ў савецкім правасуддзі заўсёды складаўся з двух кампанентаў: арганізацыйнага і працэсуальнага. З гэтай прычыны удзел грамадскасці ў судаводстве не абмяжоўваўся толькі ўдзелам яе прадстаўнікоў у судовым разборы, але і закранаў, у першую чаргу, пытанні сувязі суда, грамадскіх арганізацый і яе прадстаўнікоў паміж сабой. Арганізацыйны момант адыгрываў самую важную ролю ў прэвентыўнай функцыі ўдзелу грамадскасці. Належная арганізацыя сувязі суда і грамадскасці дазваляла выпрацоўваць эфектыўныя меры для ўздзеяння на стан законнасці на месцах, прыцягнуць увагу грамадскасці да пэўнай праблемы.

Такім чынам, на працягу існавання савецкай дзяржавы ў будаўніцтве судовай сістэмы панаваў ленінскі прынцып удзелу працоўных у сацыялістычным правасуддзі. Гістарычна склаліся наступныя напрамкі рэалізацыі дадзенага прынцыпу: канчатковае скасаванне імперскіх судоў, стварэнне масамі працоўных па сваёй ініцыятыве новых савецкіх судоў і іх далейшы ўдзел у судовай дзейнасці, здзяйсненне грамадзянамі сацыялістычнага правасуддзя шляхам выканання абавязкаў суддзяў і народных засядацеляў, удзел у судовай дзейнасці ў якасці грамадскіх абаронцаў і абвінаваўцаў, а таксама развіццё іншых формаў удзелу грамадскасці ў савецкім крымінальным працэсе. З перабудоўваннем грамадства на сацыялістычных рух у савецкай дзяржаве зарадзіліся і былі развіты сацыяльна-палітычныя перадумовы ўдзелу грамадскасці ў правасуддзі.

1. Ленин В. И. Полное собрание сочинений : в 55 т. 5-е изд. М. : Госполитиздат, 1958–1965. Т. 35 : Октябрь 1917–март 1918. 1962. 599 с. Вернуться к статье

2. Ленин В. И. Полное собрание сочинений : в 55 т. 5-е изд. М. : Гос. изд-во полит. лит., 1965–1975. Т. 4 : 1898 – апрель 1901. 1967. 565 с. Вернуться к статье

3. Ленин В. И. Полное собрание сочинений : в 55 т. 5-е изд. М. : Гос. изд-во полит. лит., 1965–1975. Т. 2 : 1895–1897. 1967. 677 с. Вернуться к статье

4. Ленин В. И. Полное собрание сочинений : в 55 т. 5-е изд. М. : Гос. изд-во полит. лит., 1958–1965. Т. 36 : Март – июль 1918. 1962. 741 с. Вернуться к статье

5. Программа Российской коммунистической партии (большевиков). 1919 г. [Электронный ресурс] : принята VIII съездом РКП(б) 18–23 марта 1919 г. // Фонд

изучения наследия П. А. Столыпина. URL: http://музейреформ.рф/node/13768 (дата обращения: 11.03.2024). Перейти к источнику Вернуться к статье

6. Ленин В. И. Полное собрание сочинений : в 55 т. 5-е изд. М. : Гос. изд-во полит. лит., 1958–1965. Т. 41 : Май – ноябрь 1920. 1963. 695 с. Вернуться к статье

7. Якимов П. П. Правосудие и общественность. Свердловск : Среднеурал. книж. изд-во, 1977. 166 с. Вернуться к статье

8. Ленин В. И. Полное собрание сочинений : в 55 т. 5-е изд. М. : Гос. изд-во полит. лит., 1958–1965. Т. 37 : Июль 1918 – март 1919. 1963. 747 с. Вернуться к статье

9. Ленин В. И. Полное собрание сочинений : в 55 т. 5-е изд. М. : Гос. изд-во полит. лит., 1958–1965. Т. 22 : Июль 1912 – февраль 1913. 1961. 597 с. Вернуться к статье

10. Ленин В. И. Полное собрание сочинений : в 55 т. 5-е изд. М. : Гос. изд-во полит. лит., 1958–1965. Т. 38 : Март – июнь 1919. 1963. 579 с. Вернуться к статье

11. Программа Коммунистической Партии Советского Союза [Электронный ресурс] : принята XXII съездом КПСС в 1961 г. URL: http://aleksandr-kommari.narod.ru/kpss_programma_1961.htm (дата обращения: 11.03.2024). Перейти к источнику Вернуться к статье